УДК 633.112.9«324»:632.9(476)

У. П. САМСОНАЎ, Т. М. БУЛАВІНА

УПЛЫЎ СРОДКАЎ АХОВЫ РАСЛІН НА ЎРАДЖАЙНАСЦЬ АЗІМАГА ТРЫЦІКАЛЕ ДАР БЕЛАРУСІ

Важным рэзервам павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур з'яўляецца барацьба са стратамі збожжа. Ва ўмовах Беларусі пустазелле, шкоднікі і хваробы зніжаюць ураджайнасць збожжавых культур на 20—25% [1]. Акрамя таго, у асобныя гады страты збожжа, выкліканыя паляганнем пасеваў, ацэньваюцца ў рэспубліцы ў 550—600 тыс. т [2]. Для стабілізацыі ўраджайнасці ў вытворчасці на сучасным этапе вялікае значэнне мае рацыянальнае выкарыстанне пестыцыдаў і рэгулятараў росту.

Азімае трыцікале з'яўляецца новай збожжавай культурай, якая ў апошнія гады ўкараняецца ў вытворчасць. Даследаванні паказалі, што трыцікале мае рад біялагічных асаблівасцей, якія неабходна прымаць да ўвагі пры доглядзе пасеваў. Так, напрыклад, у параўнанні з пшаніцай трыцікале больш моцна пашкоджваецца шведскай мухай [3] і ў меншай ступені — п'яўкай і ліставымі злакавымі пілільшчыкамі [4]. Шмат якія сарты гэтай культуры схільныя да палягання [5].

Наконт устойлівасці трыцікале да грыбных хвароб існуюць розныя думкі, у тым ліку і прама супрацьлеглыя [6—8]. Супярэчлівасць атрыманых вынікаў звязана з тым, што характар ахоўных рэакцый у розных сартоў трыцікале неаднолькавы (устойлівыя да грыбных захворванняў сарты маюць вялікую колькасць кутыкулярных выдзяленняў) [9]. Гэта сведчыць пра тое, што ахоўныя мерапрыемствы на пасевах трыцікале павінны ўлічваць не толькі асаблівасці культуры, але і спецыфіку асобных сартоў. У сувязі з гэтым адной з актуальных задач з'яўляецца вывучэнне рэакцыі сартоў на дзеянне хімічных прэпаратаў.

У 1988—1990 гг. на эксперыментальнай базе «Жодзіна» БелНДІ земляробства і кармоў праводзілі даследаванні па вывучэнні ўплыву сродкаў аховы раслін на ўраджайнасць азімага трыцікале Дар Беларусі.

Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая лёгкасуглінкавая, з глыбіні 40—50 см падсцілаецца дробназярністым пяском, з наступнымі аграхімічнымі паказчыкамі: pH_{KCl} 5,95—6,05, гідралітычная кіслот-

насць — 1,47—1,49, сума паглынутых асноў — 5,0—6,6 мг·экв/100 г глебы, P_2O_5 і K_2O — адпаведна 16—18 і 14—15 мг/100 г глебы. Папярэднік— гароха-аўсяная сумесь, паўтаральнасць чатырохразовая.

Перад закладваннем доследу пад перадпасяўную культывацыю ўносілі фосфарна-калійныя ўгнаенні ў дозе $P_{60}K_{110}$. Норма высявання насення 4 млн шт/га. Пасля сяўбы для барацьбы з пустазеллем ужывалі сімазін у дозе 0,3 кг/га. Азот у дозе N_{90} уносілі ўвесну ў два прёмы. Для знішчэння пустазелля ўвесну выкарыстоўвалі 2М-4ХП у дозе 4 кг/га.

Метэаралагічныя ўмовы ў перыяд правядзення даследаванняў адрозніваліся як па тэмпературным рэжыме, так і па колькасці ападкаў. Неабходна адзначыць, што ў 1989 г. перад уборкай ішлі дажджы ліўневага характару з градам, а гэта выклікала паляганне пасеваў і абсыпанне зерня з коласа. У 1990 г. у гэты ж перыяд таксама колькасць ападкаў была вялікай.

Вынікі даследаванняў паказалі, што розныя спосабы апрацоўкі насення па-рознаму ўплываюць на ўраджайнасць азімага трыцікале Дар Беларусі. У сярэднім за перыяд даследаванняў інкрустацыя насення байтанам забяспечыла прыбаўленне ўраджайнасці 2,4 ц/га ў параўнанні з пратручваннем насення гэтым жа прэпаратам (табл. 1). Выкарыстанне пры інкрустацыі сумесна з байтанам туру або карталіну было немэтазгодным, паколькі прыбаўленне ўраджайнасці на гэтых варыянтах паменшылася адпаведна да 1,9 і 0,4 ц/га. Сумеснае выкарыстанне пры інкрустацыі туру і карталіну таксама ўступала па эфектыўнасці інкрустацыі толькі байтанам.

Ужыванне пры інкрустацыі сумесна з байтанам мікраэлементаў таксама адмоўна адбілася на ўраджайнасці трыцікале. У сярэднім за два гады ўраджайнасць збожжа на гэтым варыянце зменшылася на 0,9 ц/га ў параўнанні з пратручваннем байтанам.

Сорт трыцікале Дар Беларусі высакарослы, што выклікае ў асобныя гады значнае паляганне пасеваў. У сувязі з гэтым вялікую цікавасць уяўляе вывучэнне яго рэакцыі на ўжыванне рэтардантаў. У доследзе выкарыстоўвалі восеньскае і веснавое ўнясенне туру. Высветлена, што ўнясенне туру ўвосень істотна не ўплывала на ўраджайнасць збожжа. Пры ўнясенні туру ўвесну прыбаўленне ўраджайнасці збожжа трыцікале склала ў сярэднім 5,7 ц/га.

Даследаванні паказалі, што трыцікале Дар Беларусі добра рэагуе

Табліца 1. **Уплыў сродкаў аховы раслін на ўраджайнасць азімага трыцікале Дар Беларусі, ц/га**

Варыянт	Ураджайнасць			Прыбаўленне	
	1989 г.	1990 г.	у сярэднім	ц/га	%
1. Пратручванне насення байтанам	36,9	33,9	35,4	0	0
2. Інкрустацыя насення байтанам — фон	38,9	36,7	37,8	2,4	6,8
3. Фон+мікраэлементы	35,6	33,3	34,5	—0,9	—2,5
4. Фон+карталін	37,4	34,2	35,8	0,4	1,1
5. Фон+карталін+тур	36,4	36,4	36,4	1,0	2,8
6. Фон+цілт увесну	41,2	37,4	39,3	3,9	11,5
7. Фон+тур (насенне)	37,1	37,5	37,3	1,9	5,4
8. Фон+тур увосень	39,2	36,4	37,8	2,4	6,8
9. Фон+тур увесну	39,3	42,8	41,1	5,7	16,1
10. Фон+фундазол увосень	41,6	43,9	42,8	7,4	20,9
11. Фон+фундазол увосень і ўвесну	41,1	46,8	44,0	8,6	24,3
12. Фон+фундазол увесну	43,6	48,5	46,1	10,7	30,2
13. Сума вар. 2—12	42,3	54,2	48,3	12,9	36,4
P, %	2,65	2,82			
$НІР_{05}$, ц/га	2,99	3,25			

Заўвага. Сродкі аховы раслін, адзначаныя ў схеме доследу, ужывалі ў дозах, рэкамендаваных для азімых збожжавых культур.